Аддзел адукацыі, спорту і турызму Жлобінскага райвыканкама
Дзяржаўная ўстанова адукацыі “Майская базавая школа
Жлобінскага раёна”

# Факультатыўны занятак па беларускай мове ў 7 класе

## “Дзеепрыслоўі закончанага і незакончанага трывання”

15

**Факультатыўныя заняткі па беларускай мове ў 7 класе**

**Падрыхтавала С.І. Жураўлёва, настаўнік беларускай мовы і літаратуры**

**Тэма**: Дзеепрыслоўі закончанага і незакончанага трывання

**Мэта:**

- замацоўваць веды пра трыванне дзеепрыслоўяў, набытыя на ўроку;

**Задачы:**

- ствараць умовы для павышэння матывацыі да вывучэння прадмета, цікавасці да беларускай мовы;
- праз гульнёвыя сітуацыі выпрацоўваць пэўныя ўменні і навыкі;
- спрыяць развіццю кемлівасці і творчых здольнасцей
- ствараць умовы для выхавання павагі да роднай мовы, спадчыны народа

Напрыканцы заняткаў вучні павінны

**ВЕДАЦЬ**:

- паняцце катэгорыі трывання і трывальных пар
- спосабы ўтварэння трывальных пар

**УМЕЦЬ**:

- вызначаць трыванні дзеепрыслоўяў;
- ужываць дзепрыслоўі рознага трывання ў мове

## Ход заняткаў

**І.Арганізацыйны момант**

Прывітанне, паважаныя сябры! Мы працягваем з вамі падарожжа па краіне Марфалогіі, а ў прыватнасці, па вобласці дзеяслова, і шлях наш ляжыць праз нейкі горад, назва якога і будзе тэмай нашых заняткаў. А для таго, каб вызначыць гэту назву, яго жыхары прапануюць нам “Арфаграфічны бой”

**<u>1.” Арфаграфічны бой”</u>**

Газе…чык, а…тылерыя, ад…шоў, Лары…он, характ…рыстыка, ако…ы, кал…ндары, ад…ячыць, м…тро, с…ржант, рас…ыпаць, раздол…е, ад…лецць, …осень, лат…рэя

– уставіць прапушчаныя літары, растлумачыць правапіс

- ад дзеясловаў утварыць дзеепрыслоўі (калі гэта магчыма) : адышоў – адышоўшы, аддзячыць- аддзячыўшы і г.д.
- вызначыць трыванне

**<u>2. Вызначэнне тэмы і мэты заняткаў</u>**

**ІІ. Работа па тэме заняткаў.**

1. Жыхары горада вырашылі вызначыць, ці добра вы іх ведаеце і ці зможаце распазнаць у натоўпе сярод іншых.

   Прапаную вам папрацаваць з пр.27 на с.95 (Слова ў тэксце: 7-ы клас: вучэбна-метадычны комплекс/ Валочка Г.М. – Мінск: Нац.інстытут адукацыі, 2010.- (Беларуская мова. Факультатыўныя заняткі):

*Што рабіць? – Што робячы?*
Пісаць - піш*учы*
Думаць – дума*ючы і г.д.*
*Што зрабіць? – Што зрабіўшы?*
Напісаць – напіса*ўшы*
Падумаць – падума*ўшы і г.д.*

2. Праца з пр. 28: Утварыце ад дзеясловаў, што ў дужках, дзеепрыслоўі патрэбнага трывання (можна вусна)
    1. Тугія струменьчыкі адзін за адным выбіваліся з нетраў зямлі, кіпелі маленькімі фантанчыкамі, (варушыць) пясчынкі і жвір. (Я.Сіпакоў). 2. (Прабіцца) з зямлі, (адчуць) волю, вада супакойвалася, ды не спыняла свайго разгону: некалькі метраў бегла вузкім раўчуком і ўлівалася ў бязменную рэчку (Я.Сіпакоў) і г.д.
3. А цяпер я прапаную вам **кадзіраваны дыктант** . Калі я называю дзеепрыслоўе незаконченага трывання, вы ставіце 0, калі закончанага – 1

Адкрыўшы
Сціхаючы
Рухнуўшы
падмёўшы
Здагадаўшыся
Вызначыўшы
Купаючыся
Шыючы
Збіраючы
Прынесшы
**КЛЮЧ:** 1011110001
(вучні атрымоўваюць фішку: блакітную – без памылак, чырвоную- калі былі памылкі.)

4. Наступнае выпрабаванне **“Пазнавальны рынг”.**
Хадзіў Спарыш па вуліцы,
По вуліцы па шырокай,
Па мураўцы па зялёнай

Скажыце, ці чулі вы раней пра Спарыша? Што гэта за істота?

Спарыш уяўляўся чалавеку міфічнай істотай, якая ўвасабляла сілу ўрадлівасці. Спарышовыя песні ўтваралі ў жніўным цыкле абрадавых песень асобны падраздзел са сваёй тэматыкай, накіраванай на павелічэнне ўрадлівасці нівы, дабрабыту сям’і, спору ў вядзенні гаспадаркі. У народзе існавала вера ў тое, што дзяўчына, якая з’есць спарыша, народзіць двайнят.
У якіх яшчэ міфічных істот верылі беларусы?
Мы бачым, што ў народным уяўленні духі падзяляюцца на добрых і злых.

5. **А я прапаную вам наступнае заданне. Вызначыць час і трыванне дзеясловаў**. **Утварыць ад іх дзеепрыслоўі, вызначыць трыванне**

Шануюць (цяп.ч., нез.тр.) дамавіка - (шануючы – нез.тр.) і г.д.
Вадзянік шкодзіць(цяп.ч., нез.тр.) чалавеку- шкодзячы (…)
Уцягвае (…) ў ваду - …..(….)
Існавала (пр.ч.) вера - (…(…)
Трэба задобрыць (…) яго - …(…)
Жыве (…) ў рэках і азёрах - …(…)
Зрабіць (…) зло - …(…)

*<u>Вывад:</u> ад дзеясловаў незакончанага трывання ўтвараюцца дзеепрыслоўі незакончанага трывання, а ад дзеясловаў закончанага трывання - дзеепрыслоўі закончанага трывання*

6. Наступнае выпрабаванне. Жыхары горада просяць дапамогі. У горадзе была бура і многія трывальныя пары разбурыліся і не могуць знайсці свае суфіксы. Наша з вамі задача: успомніць спосабы ўтварэння трывальных пар і дапамагчы жыхарам горада. Звярніце ўвагу на табліцу, што ляжыць у вас на парце і запоўніце яе.
   ( дзеепрыслоўі нез.тр. ўтвар. з дап. суфіксаў – … учы/ючы (ад дзеясл.1 спр.), ачы/ячы (ад дзеясл.2 спр.);
   дзеепрыслоўі зак..тр. ўтвар. з дап. суфіксаў - … ўшы/шы….)

Ну, а цяпер спяшаемся на пошукі трывальных пар.

Дэманстру… (ючы), выеха…(ўшы), прадэманстрава…(ўшы) выязджа…(ючы), прадэманстрава…(ўшы), прывязва…(ючы), прывяза…(ўшы)

7. Наступнае наша выпрабаванне **“Залацінкі мудрасці”.** Вам неабходна праявіць сваю кемлівасць і спалучыць фразеалагізмы з іх значэннем

| | |
|---|---|
| Матаючы на вус | цёмна |
| Валячы з хворай галавы на здаровую | абвінавачваць бязвіннага |
| Кідаючыся ў вочы | марная трата часу |
| Хоць вока выкалі | браць пад увагу |
| Пераліваючы з пустога ў парожняе | звяртаць на сябе ўвагу |

8. Апошняе наша выпрабаванне **“Карэктары”.** У друкарні пасля буры перамяшаўся тэкст і страціліся некаторыя дзеясловы. Вам неабходна ўставіць іх, карыстаючыся даведкай, паставіць ў патрэбнай форме , а таксама падабраць дзеепрыслоўі ці дзеепрыслоўныя звароты, якія б паказвалі на дадатковае дзеянне. Дзеясловы падкрэсліць адной лініяй, а дзеепрыслоўі (дзеепрыслоўныя звароты) выдзеліць пастай іншага колеру. Запісаць прыдуманыя сказы
   Узор: Ліса, *агледзеўшыся*, <u>выслізнула</u> з-пад жоўтых галінак папараці.

Ліса______________з-пад жоўтых галінак папараці. На фоне зялёных елачак рыжае футра _________________, як агонь. _______________ясныя бурштынавыя вочы. Лёгкім трушком ліса

____________________палянку і ___________________каля старой яліны. Гнуткая постаць _________________на месцы. Вострыя чорныя вушы насцярожаны. Толькі кончык пушыстага хваста ледзь прыкметна ____________________________.

**Словы для даведак**: выслізнуць, варушыцца, гарэць, застыць, блішчаць, перабегчы, знікнуць

**III. Падвядзенне вынікаў.**

1. Зварот да задач урока
2. Прымацуйце каляровыя паперкі насупраць кожнага сцвярджэння: аранжавы колер, калі вы добра засвоілі тэму, жоўты – калі ёсць пытанні і трэба яшчэ папрацаваць